ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 34 (1221) ● 23 лістапада 1978 г. Цана 2 кап.

## НДР — У ВЫТВОРЧАСЦЬ

Падведзены папярэднія вынікі конкурсу сярод кафедр, якія выконваюць гасдагаворныя НДР на лепшую пастаноўку і арганізацыю работы па ўкараненню дасягненняў універсітэцкай навукі ў народную гаспадарку краіны.

У разлік прымаліся вынікі, дасягнутыя да 15 кастрычніка 1978 года і плануемыя гадавыя паказчыкі ўкаранення і эфектыўнасці, зацверджаныя дакументальна. Улічваўся навукова-тэхнічны ўзровень НДР: узнагароды, атрыманыя на ВДНГ СССР, ВДНГ БССР, колькасць вынаходстваў і іншыя паказчыкі.

Сярод шасці галіновых навукова-даследчых лабараторый, якія працуюць ва універсітэце, лідзіруючае месца займаюць два самыя маладыя калектывы — створаныя ў 1978 годзе галіновая навукова-даследчая лабараторыя фізічных метадаў і сродкаў дыягнастычнага кантролю стану сілавых установак (загадчык лабараторыі кандыдат тэхнічных навук У. І. Мікуловіч) і ГНДЛ сродкаў і метадаў апрацоўкі аптычнай інфармацыі (загадчык лабараторыі дацэнт І. Р. Гулакоў).

Распрацаваны лабараторыяй дыягнастычнага кантролю стану сілавых установак аналізатар вібрацыі паспяхова праходзіць вопытна-прамысловую праверку на Мінскім авіярамонтным заводзе. Эканамічны эфект ад яго выкарыстання ў гэтым годзе складзе 200 тыс. рублёў. Прылада ўзнагароджана сярэбраным медалём ВДНГ СССР, адзначана дыпломам ВДНГ БССР. Высокай адзнакі спецыялістаў Дзяржаўнага інстытута прыкладной оптыкі заслужыла прыёмна-рэгіструючая сістэма атамна-абсарбцыённага і атамна-флуарэсцэнтнага спектрафотаметра, створаная ў лабараторыі сродкаў і метадаў апрацоўкі аптычнай інфармацыі.

Лепшыя паказчыкі сярод кафедр універсітэта мае калектыў кафедры ядзернай фізікі. У 1978 годзе ў народную гаспадарку ўкараняюцца вынікі пяці навукова-даследчых работ, выкананых на кафедры. Гадавы эканамічны эфект ад іх выкарыстання складзе больш як 600 тысяч рублёў. Добрых вынікаў таксама дасягнулі кафедры неарганічнай і фізічнай хіміі, якія займаюць адпаведна другое і трэцяе месцы.

Належыць падкрэсліць, што падведзены толькі папярэднія вынікі конкурсу, і многія падраздзяленні яшчэ могуць змяніць сваё становішча ў конкурснай табліцы. Напрыклад, кафедра электронна-матэматычных машын, якая валодае вельмі значным навуковым патэнцыялам, вызначаецца высокім навукова-тэхнічным узроўнем сваіх распрацовак, у цяперашні час займае толькі васемнаццатае месца.

Хацелася б звярнуць увагу кіраўнікоў кафедр і навукова-даследчых лабараторый на важнасць такой формы сувязі універсітэцкай навукі з вытворчасцю, якой з'яўляюцца дагаворы на перадачу навукова-тэхнічных дасягненняў універсітэта прадпрыемствам і арганізацыям. Гэта дазваляе істотна расшырыць маштабы і паказчыкі ўкаранення вынікаў НДР.

Конкурс працягваецца. Канчатковыя вынікі будуць падведзены ў студзені 1979 года.

Г. БАРАНАЎ.

ВОПЫТАМ ДЗЕЛІЦЦА ПАРТГРУПОРГ

## СТЫМУЛ СТВАРАЛЬНАЙ ПРАЦЫ

КПСС разглядае крытыку як верны і выпрабаваны сродак выпраўлення недахопаў і паляпшэння справы, правільнага выхавання кадраў, як абавязковую ўмову і стымул для стваральнай работы, развіцця творчай актыўнасці мас. У. І. Ленін пастаянна патрабаваў шырока прымяняць у партыйнай рабоце крытыку і самакрытыку, якія выражаюць рэвалюцыйны характар нашага развіцця, непарыўна звязаны з самой сутнасцю нашага грамадства, з дзейнасцю КПСС.

Важнай вяхой у далейшым развіцці ленінскіх палажэнняў аб крытыцы і самакрытыцы з'явілася прынятая ў пачатку 1975 года пастанова ЦК КПСС «Аб стане крытыкі і самакрытыкі ў Тамбоўскай абласной партыйнай арганізацыі», якая была абмеркавана на партыйным сходзе біялагічнага факультэта. У абмеркаванні актыўны ўдзел прымалі і камуністы партгрупы аддзела мікрабіялогіі.

Кіруючыся ленінскімі палажэннямі, пастановай ЦК КПСС і рашэннямі XXV з'езда КПСС, партгрупа аддзела мікрабіялогіі імкнецца будаваць сваю работу на аснове няўхільнага прытрымлівання ленінскіх норм партыйнага жыцця, развіцця крытыкі і самакрытыкі, павышэння палітычнай і працоўнай актыўнасці супрацоўнікаў і студэнтаў.

У партгрупе выпрацавана пэўная сістэма ўліку, вывучэння і абагульнення крытычных заўваг і прапаноў, выказваемых на партсходах, саветах факультэта, нарадах партыйнага актыву і савеце куратараў. Усе заўвагі і прапановы ў залежнасці ад іх значымасці рашаюцца на сходзе партгрупы, кафедры або камсамольскай арганізацыі. На пасяджэнні распрацоўваюцца мерапрыемствы па рэалізацыі той ці іншай крытычнай заўвагі або прапановы, прынятыя рашэнні даводзяцца да ведама кіраўнікоў тых падраздзяленняў, у адрас якіх былі выказаны заўвагі (камсоргі, прафоргі, куратары). Напрыклад, было праведзена сумеснае пасяджэнне партгрупы, кафедры і камсамольскага бюро, на якім абмяркоўваўся стан ідэйна-выхаваўчай работы ў камсамольскай арганізацыі студэнтаў. Намечаныя мерапрыемствы па паляпшэнню работы былі даведзены да ведама групкамсоргаў, затым былі заслуханы справаздачы камсоргаў на камсамольскіх сходах і ўлічаны пры атэстацыі па ГПП.

Вялікую дапамогу партгрупе ў рэалізацыі крытычных заўваг і прапаноў аказваюць куратары, якія працуюць у цесным кантакце з партгрупай. Такі цесны кантакт з'яўляецца адным з галоўных фактараў павышэння эфектыўнасці работы па рэалізацыі крытычных заўваг.

Адным з важных момантаў у рабоце партгрупы з крытычнымі заўвагамі з'яўляецца арганізацыя кантролю і праверкі выканання прынятых рашэнняў. Як указвалася ў Справаздачным дакладзе ЦК КПСС XXV з'езду партыі, кантроль і праверка выканання прынятых рашэнняў — важнейшая частка арганізацыйнай работы.

Партгрупа здзяйсняе дакладны кантроль за выкананнем прынятых рашэнняў і ў выпадку неабходнасці эфектыўна выкарыстоўвае такую добра зарэкамендаваўшую сябе яшчэ ў ходзе абмену партыйных дакументаў форму работы, як індывідуальнае субяседаванне з камуністамі (або камсамольцамі), якія ігнаруюць крытыку сваіх таварышаў. У партгрупе практыкуецца заслухоўванне справаздач камуністаў аб выкананні Статута КПСС. Вопыт работы партгрупы паказвае, што такія гутаркі і справаздачы, якія праведзены ў адкрытай і добразычлівай форме, з'яўляюцца эфектыўным сродкам выхавання камуністаў, садзейнічаюць росту іх вытворчай і грамадска-палітычнай актыўнасці.

Агульным вынікам работы партгрупы па рэалізацыі крытычных заўваг, арганізацыі кантролю і праверкі выканання прынятых партгрупай і кафедрай рашэнняў з'яўляюцца высокія паказчыкі па навукова-метадычнай, навукова-даследчай і выхаваўчай рабоце. Кафедра на працягу шэрагу гадоў з'яўляецца пераможцай сацыялістычнага спаборніцтва на біяфаку.

Аднак у рабоце партгрупы з крытычнымі заўвагамі выкарыстаны не ўсе сродкі і метады. У арсенале партыйна-арганізатарскай работы такіх сродкаў шмат, і трэба імкнуцца да іх больш поўнага і ўмелага выкарыстання для павышэння камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі і ўзмацнення адказнасці камуністаў за стан агульнапартыйнай работы.

В. КАЛЕШКА,
партгрупорг аддзела мікрабіялогіі біялагічнага факультэта.

ДА ЎСЕСАЮЗНАГА ПЕРАПІСУ

## ВАЖНАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ СПРАВА

Матэрыялы перапісаў насельніцтва маюць важнае палітычнае значэнне, яны дапамагаюць нагляднa паказаць усю веліч нашых поспехаў у будаўніцтве камунізму. Прадстаячы перапіс будзе праводзіцца праз дзевяць гадоў пасля перапісу насельніцтва 1970 года. У ім знойдуць адлюстраванне вынікі творчай дзейнасці савецкага народа ў перыяд, калі ажыццяўляліся і ажыццяўляюцца гістарычныя рашэнні XXIV і XXV з'ездаў КПСС. У гэтыя гады была здзейснена такая шырокая праграма сацыяльных мерапрыемстваў, якой яшчэ не ведала гісторыя нашай краіны. Разам з уздымам эканомікі, навукі, культуры, ростам матэрыяльных і духоўных багаццяў грамадства адбываюцца істотныя змены і ў саставе насельніцтва, якія знойдуць сваё адлюстраванне ў матэрыялах прадстаячага перапісу.

Перапіс насельніцтва 1979 года будзе праводзіцца нямногім больш чым праз год пасля таго, як уся наша краіна і прагрэсіўнае чалавецтва адзначылі знамянальны юбілей — 60-годдзе Вялікага Кастрычніка. У сваім дакладзе на XXV з'ездзе КПСС таварыш Л. І. Брэжнеў сказаў: «Шэсць дзесяцігоддзяў — гэта менш, чым сярэдняя працягласць жыцця чалавека. Але за гэты час наша краіна прайшла шлях, роўны стагоддзям». Параўноўваючы вынікі перапісу аб саставе насельніцтва, мы з законным гонарам можам прасачыць увесь гістарычны шлях нашага народа.

Выконваючы ленінскі план сацыялістычнай індустрыялізацыі, наша краіна за гады Савецкай улады ператварылася ў магутную індустрыяльную дзяржаву. У дарэвалюцыйнай Расіі па даных першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва 1897 года ў гарадскіх пасяленнях пражывала толькі 15 працэнтаў жыхароў краіны, большасць насельніцтва была сельскагаспадарчай. У 1977 годзе гарадское насельніцтва склала 62 працэнты насельніцтва краіны. Доля сельскага насельніцтва скарацілася да 38 працэнтаў. У той жа час дзякуючы ўзросшаму ўзроўню механізацыі і павышэнню вытворчасці працы на сяле агульны аб'ём вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў 1976 годзе павялічыўся ў параўнанні з дарэвалюцыйным 1913 годам у 3,3 раза.





Нядаўна ва універсітэце адбылося ўрачыстае ўручэнне юбілейных медалёў «60 год Узброеных Сіл СССР» ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і Узброеных Сіл СССР.

На здымках: у час уручэння.

Фота М. Дубовіка.



Немногословье школьных аттестатов—
Пока несложный жизненный багаж,
Но каждого студенческое братство
Уже зовёт чудесным словом «Наш!»
Мы—первый курс любого
факультета.
Мы—символ всех непройденных
дорог.
Нам—начинать сначала. А ведь это
Так сложно, так ответственно, так
много...

# СТАРОНКА

## «Вучыся вучыцца»

**Любому студэнту-старшакурсніку заўсёды ёсць чым падзяліцца з тымі, хто толькі-толькі прыйшоў на факультэт. Ну, а калі ты выдатнік, ты не толькі можаш — абавязан падзяліцца з першакурснікамі «сакрэтам» свайго поспеху. Так вырашылі члены савета выдатнікаў мехмата і арганізавалі яшчэ ў мінулым годзе для першакурснікаў лекторый пад назвай «Вучыся вучыцца».**

**У кожнай групе 1 курса выдатнікі факультэта правялі заняткі, на якіх пазнаёмілі навічкоў з гісторыяй факультэта, падзяліліся вопытам арганізацыі працоўнага дня, падрыхтоўкі да практычных і семінарскіх заняткаў, вопытам падрыхтоўкі да экзаменаў.**

**Па запрашэнню савета выдатнікаў да першакурснікаў прыходзілі супрацоўнікі універсітэцкай кафедры псіхалогіі і знаёмілі іх з больш вузкімі і складанымі пытаннямі, такімі, як тайны памяці, гігіена разумовай працы і г. д. Гэтыя сустрэчы звычайна вельмі цікавяць студэнтаў. Яны карысныя і выклікаюць у слухачоў мноства пытанняў.**

**У бягучым навучальным годзе наш лекторый, узбагачаны вопытам мінулага года, узнавіў сваю работу. Перад першакурснікамі ўжо выступілі выдатнікі-чацвёртакурснікі Аляксандр Галубінскі і Аляксей Тарле.**

**Т. ШУМАК,**
**студэнтка V курса, старшыня савета выдатнікаў мехмата.**

# АЗБУКА САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ

СЁННЯШНІ першакурснік хаця і знаходзіцца яшчэ ў пачатку вялікага шляху да ведаў, да авалодання прафесіяй, але, вобразна кажучы, ён ужо «ўнесен» у рэестр працаўнікоў дзесятай пяцігодкі. У складаным, мнагапланавым дзяржаўным арганізме вызначаны яго месца і роля. Нельга дапусціць, каб гэта месца засталося вакантным і роля—нявыкананай.

Таварыш першакурснік! Твая паспяховасць, а такім чынам і ўзровень тваёй падрыхтоўкі як будучага спецыяліста ў многім залежаць ад першых месяцаў знаходжання ва універсітэце. Змог адапціравацца — паспяваеш, не змог — адстаеш.

Прычын адставання многа. Найбольш агульныя з іх: неарганізаванасць, няўменне размяркоўваць свой рабочы час для самастойнай падрыхтоўкі, недастатковая падрыхтаванасць у сярэдняй школе, няўменне хутка прыстасавацца да новых форм і метадаў адукацыі ў ВНУ, захапленне іншымі відамі дзейнасці. Адзначым яшчэ адзін важны фактар: адсутнасць рэгулярнага кантролю за ходам вучобы. Учарашні дзесяцікласнік, які прывык да штодзённай праверкі хатніх заданняў, не заўсёды можа адразу перайсці на штодзённую самастойную работу. Атрымаўшы самастойнасць і свабоду (акрамя абавязковага наведвання акадэмічных заняткаў), ён часам не можа распарадзіцца імі і практычна першыя месяцы не працуе з падручнікам і кнігай. Семінары, кантрольныя работы, калёквіумы здаюцца яму вельмі далёкімі. Рэжым заняткаў ва універсітэце ствараe ілюзію «вольнага жыцця», ілюзію беспакаранасці за дарма загублены час.

Захапляючыся мноствам цікавых спраў (канцэрты, дыспуты, спартыўныя спаборніцтвы, мастацкая самадзейнасць), ты не прыкмячаеш, як спачатку зразумелыя лекцыі становяцца ўсё больш незразумелымі, а патрабаванні да ведаў дастаткова высокія, і вось ужо паяўляюцца запазычанасці — спачатку бягучыя, потым на экзаменах. Скажаце, што так не бывае і што тут намалявана змрочная перспектыва. На жаль, так бывае. Так бывае таму, што ты не заўсёды можаш кантраляваць і ацэньваць сябе, не можаш скласці графік самастойнай работы па кожнаму прадмету на семестр і прытрымлівацца тэрмінаў яго выканання. Так бывае таму, што на першых парах ты не прыкмячаеш, што ў лекцыях выкладаецца параўнальна невялікая частка таго матэрыялу, які трэба засвоіць. Астатняе неабходна засвоіць самастойна. Часам парады «бывалых» студэнтаў ствараюць уяўленне аб магчымасці «вывучыць» матэрыял у перыяд непасрэднай падрыхтоўкі да экзаменаў. Вось і складваецца думка, што іменна ў сесію можна нейк кампенсіраваць сваю бяздзейснасць на працягу ўсяго семестра.

Штурмаўшчына, прымяняльна да студэнта, азначае дрэнную арганізацыю самастойнай работы, пры якой пасля лодырніцтва на працягу семестра ідзе празмерна напружаная праца ў экзаменацыйны перыяд. Нават тады, калі табе ўдаецца ў такім выпадку здаць усе экзамены на добра і выдатна, добрыя адзнакі атрыманы дарагой цаной, за кошт страты якасці. Мала і несістэматычна працуючы на працягу года, ты выконваеш вялізную работу непасрэдна перад экзаменамі. У выніку ўзнікае перагрузка нервовай сістэмы, нервоваеператамленне. Тэкст падручніка або канспекта, прачытаны стомленым чалавекам і які ўсведамляе, што часу не хапае, проста не засвоіцца, не замацуецца ў памяці. Такі стыль работы, залішняя самаўпэўненасць можа ператварыць цябе ў шэрую безаблічную пасрэднасць, увесь сэнс жыцця якой пачынае вызначацца жаданнем «спіхнуць» экзамены, каб атрымаць стыпендыю. Аб эфектыўнасці атрыманых ведаў, іх якасці, тваім агульнаадукацыйным узроўні і гаварыць не прыходзіцца.

Адзначым яшчэ адзін важны фактар. Адольваемы жаданнем хутчэй вывучыць у поўным аб'ёме абавязковую і дадатковую літаратуру па ўсіх вучэбных прадметах, якія чытаюцца на курсе, і звыш таго, самастойна авалодаць яшчэ адным прадметам, ты адводзіш на сон і адпачынак 5—7 гадзін у суткі, адмаўляешся ад спорту і нават ад рэгулярнага харчавання. Такая перагрузка несумяшчальная з патрабаваннямі фізіялогіі, гігіены і адмоўна сказваецца на самаадчуванні.

І гэта не ўсё. Ты не заўсёды разумееш, што не ўмееш слухаць і запісваць лекцыю, не ўмееш самастойна рыхтавацца, вызначаць паслядоўнасць у выбары прадметаў для вывучэння, спланаваць свой асабісты час, адным словам, не валодаеш рацыянальнымі формамі паводзін ва ўмовах самастойнасці. Аб тваім няўменні слухаць лекцыі сведчыць адсутнасць пытанняў да выкладчыка. Уменне задаць пытанне, сфармуляваць яго — сведчанне тваёй мысліцельнай дзейнасці ў працэсе лекцыі.

Перш за ўсё запомні, што як бы добра ні была прачытана лекцыя, дано тлумачэнне, гэта далёка не забяспечвае засваення вучэбнага матэрыялу. Лекцыя — гэта толькі пачатак да сапраўднага набыцця ведаў. Яна мае вялікае значэнне для фарміравання пазнавальных інтарэсаў і для эфектыўнай арганізацыі самастойнай работы. Не забывай, што самастойная работа завяршае задачы ўсіх іншых відаў вучэбнай работы. Ты павінен навучыцца дакладна разлічваць свае магчымасці з тым, каб сістэматычнай, удумлівай працай над вучэбнай літаратурай атрымаць неабходныя веды.

З першых месяцаў навучання ва універсітэце ты павінен вучыцца прымяняць прафесіянальныя тэрміны, свабодна аперыраваць паняццямі, умець з прафесіянальных пазіцый будучага спецыяліста, педагога вывучаць гісторыю партыі, навуковы камунізм, педагогіку, псіхалогію і іншыя тэарэтычныя дысцыпліны.

Студэнту-першакурсніку неабходна засвоіць вучэбны матэрыял прыкладна ў 2,7 раза больш, чым вучням сярэдняй школы. Усё гэта патрабуе ад цябе больш дасканалага ўмення арганізаваць сваю самастойную работу, хутка і правільна канспектаваць, працаваць з навуковай літаратурай.

Не забывай, што галоўным крытэрыем якасці тваёй падрыхтоўкі як спецыяліста будзе з'яўляцца здольнасць да практычнай дзейнасці на наступны ж дзень пасля заканчэння ВНУ.

**М. БЕРАЗОВІН,**
**кандыдат педагагічных навук.**

**Рэдакцыя атрымала першыя пісьмы нашых чытачоў, якіх зацікавіла тэма, паднятая студэнткай журфака Л. Чыжовай у апошнім нумары нашай газеты (заметка «Я б у лектары пайшоў...).**

**На жаль, адгукнуліся пакуль толькі студэнты факультэта журналістыкі. Але мы спадзяемся, што не толькі іх хвалюе ўзнятая праблема (лекцыя як элемент грамадска-палітычнай практыкі), і чакаем водгукаў з іншых факультэтаў.**

## І яшчэ пра фармалізм

Калі мне даюць перад кожнай вытворчай практыкай дзве паперкі, на якіх красуецца назва таварыства «Веды», і кажуць: «Вось, трэба прачытаць лекцыі», я заўсёды, тут жа, пачынаю прыкідваць: дзе ж і як «цісканануць» на тыя пуцёўкі пячатку, каб адвязаліся.

І гэтак думаю не толькі я, а і іншыя студэнты. А на таго, хто гэтыя лекцыі чытае, глядзяць як на дзіва. І наогул я лічу, што карысці ад гэтых «паперак» няма нікому: ні нам, ні дэканату, ні таварыству «Веды». Дык навошта мы губляем дарэмна час, бегаючы па інстанцыях з гэтымі пуцёўкамі, лепшая назва якім — фармалізм?

**П. УЛАДЗІМІРАЎ.**

## Чаго грахі таіць...

Ці чытаюць студэнты лекцыі?

Наіўнае пытанне! Кожны студэнт у якасці справаздачы аб грамадска-палітычнай практыцы прадстаўляе дакумент — пуцёўку таварыства «Веды», дзе ўказана, на якую тэму была прачытана лекцыя і якая яе працягласць, а таксама колькі прысутнічала слухачоў.

Але я не думаю, што адкрываю Амерыку, называючы гэты дакумент «ліпавым». Прадугледжу адказ: «Ай-яй-яй, як нядобра! Нельга падманваць. Трэба чытаць лекцыі». Каб не быць галаслоўнай, звярнуся да горкага вопыту нашага курса.

У аснову зместу лекцый ляглі рэфераты па гісторыі КПСС. Цяжка прадставіць аўдыторыю, для якой прапаноўваліся тэмы: «Перамога Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і сусветны рэвалюцыйны працэс» або «Міжнароднае значэнне НЭП» і г. д., і г. д. Тут і рэдактар раённай газеты, гледзячы на практыканта, глыбакадумна часаў патыліцу...

Можна адчуць, колькі сумненняў прыйшлося на долю таго, хто, будучы па натуры добрасумленным, рашаўся выступіць, упершыню ў жыцці падняцца на трыбуну перад аўдыторыяй, перад людзьмі...

Таму ішлі рабяты ў знаёмыя калектывы (або да маці на работу), дзе лекцыя лёгка расплаўлялася ў размову аб універсітэце і студэнцкай групе. І перш чым дакараць студэнтаў у нядбайнасці і несумленнасці, варта прыкінуць на вагах фіктыўную паперку і час, на працягу якога чыталася б лекцыя, той самы час, якога ўсім нам не хапае...

**Ж. ПАГАРЭЛАВА.**

## Папера церпіць. А слухачы?..

Пуцёўка таварыства «Веды» ляжала ў маім блакноце з пачатку практыкі. Шчыра кажучы, яна была на маім сумленні. Едучы ў камандзіроўку або рыхтуючы матэрыял, я кожны раз натыкалася на яе. Час ішоў, а тэмы лекцыі ў мяне не было.

У тыя дні ў рэдакцыі мы горача абмяркоўвалі матэрыялы ліпеньскага (1978 г.) Пленума ЦК КПСС. Я з цікавасцю ўчытвалася ў радкі партыйнага дакумента. Захацелася падзяліцца ўласнымі думкамі з людзьмі і паслухаць іх. Хутка паявілася і магчымасць. Яшчэ на першай практыцы цікавілася я работай адной саўгаснай камсамольскай арганізацыі. Пазваніла яе сакратару і атрымала запрашэнне на чарговы сход.

Трыбуна, з вышыні якой мне не ўдавалася акінуць позіркам клуб, аказалася для мяне бар'ерам. Не праходзіла скаванасць. Куды падзеліся ўласныя думкі? Нібы свінцом наліты вейкі: цяжка адарваць позірк ад паперы. Зала разумела «лектара» і спачувальна маўчала.

Традыцыйнае: «Якія будуць пытанні?» — заглушылі апладысменты. Не лектару — канцу лекцыі. А на даведцы паявілася пячатка. І згубілася звычайная паперка сярод дзесяткаў такіх пуцёвак маіх аднакурснікаў. Толькі сумленне не дае спакою. На ім жа пячатку не паставіш.

Банальная ісціна: якую карысць прынясе лекцыя, падрыхтаваная маладасведчаным у гэтай галіне чалавекам, ды калі той «выпаліць» усё на адным дыханні, не ўзнімаючы вачэй ад паперы?

Ад нас, па сутнасці, патрабуюць пячатку на ружовай даведцы. Вось і ідзем мы ў канторы, бухгалтэрыі ці іншыя арганізацыі з гэтай мэтай. Такімі адносінамі да лектарскай справы мы прыніжаем, абязлічваем яе.

**Т. МАНЁНАК.**

# ПЕРШАКУРСНІКА

## Некалькі запаведзей студэнтам-першакурснікам

**Першая.** Запісы лекцый, канспект вывучаемай кнігі або артыкула трэба рабіць на адным баку ліста, і лепш за ўсё на лістах, якія вымаюцца са сшытка.

**Другая.** Прытрымлівацца этапаў вывучэння матэрыялу: а) беглае азнаямленне з матэрыялам, чытанне матэрыялаў «наскрозь» з паметкамі алоўкам на палях; в) канспектаванне; г) самаправерка засвоенага; д) робяцца вывады пры закрытай кнізе.

**Трэцяя.** Які б ні быў вялікі аўтарытэт аўтара вывучаемай кнігі, галоўнае — усё зразумець самому, а не завучваць асобныя вывады і палажэнні.

**Чацвёртая.** Асновы вывучаемай вамі навукі трэба засвоіць так, каб ужо ніякім гіпнозам іх нельга было з вас вытравіць. У кожнай галіне ведаў ёсць такія раздзелы, якія спецыяліст не мае права забываць.

**Пятая.** Трэба заўсёды памятаць, што няма ісціны ў апошняй інстанцыі, што навука межаў не ведае, што ўсякае пытанне вы можаце пашыраць і паглыбляць самі.

**Шостая.** Не забываць аб пастаянным павышэнні свайго культурнага ўзроўню — хадзіць у музеі, на выстаўкі, у тэатр, кіно, чытаць мастацкую літаратуру.

**І апошняя.** Штодзённа перад сном пытацца ў сябе, што зроблена за дзень і што трэба зрабіць заўтра.

## АВАЛОДВАЙЦЕ МАЙСТЭРСТВАМ ЧЫТАННЯ

Пераступаючы парог ВНУ, учарашні школьнік адразу трапляе ў вельмі інтэлектуальную атмасферу. Галоўным родам заняткаў для яго становіцца разумовая дзейнасць, якая цесна звязана з уменнем чытаць. Не кожны школьнік навучыўся хутка і прадукцыйна чытаць, але кожны павінен імкнуцца авалодаць гэтым майстэрствам ва універсітэце. На гэта нельга шкадаваць ні часу, ні намаганняў.

Вялікую ролю ў набыцці навыку сур'ёзнага, граматнага чытання будзе адыгрываць бібліятэка. Зараз, калі натуральнае імкненне чалавека ўсё ведаць сутыкаецца з новай з'явай — інфармацыйным выбухам, — бібліятэка бярэ на сябе не толькі функцыі захавання кніг, але і кіраўніцтва чытаннем. Толькі ў нашай краіне штогод выходзіць больш 80 тыс. кніг і больш 10 тысяч часопісаў. Разабрацца ў гэтым «моры інфармацыі» дапамогуць навыкі бібліяграфічнага адшуквання. А іх можна набыць толькі ў бібліятэцы. Бібліяграфічная эўрыстыка — захапляючая навука, зразумела якую дано толькі тым, хто самааддана ўлюбёны ў кнігу, хто адчувае сябе ў бібліятэцы, як дома.

Культура чытання выхоўваецца гадамі, і набываецца яна часцей за ўсё ў цесных зносінах з бібліятэчным светам. Будучы спецыяліст павінен ведаць кола крыніц, па якіх ён будзе сачыць за выхадам новай літаратуры, ён павінен ведаць асноўныя перыядычныя выданні па спецыяльнасці і рэгулярна праглядаць іх, ён павінен уяўляць кола даследчыкаў, якія працуюць у данай галіне — а усе гэтыя патрэбы заўсёды прыводзяць студэнта ў бібліятэку.

**І. АРЭХОЎСКАЯ,**
**дырэктар бібліятэкі БДУ.**



**Юрый Кухарчык — староста 3-й групы І курса геафака. Зараз у яго многа спраў: хутка першая сесія, і трэба як мага лепш падрыхтавацца да экзаменаў і залікаў.**

**Фота М. Дубовіка.**

## Працоўны экзамен здалі

Дзень адпраўлення на сельгасработы (быццам бы звычайны працоўны дзень) для нас, будучых філосафаў, якія толькі што прайшлі непрыступную сцяну ўступных экзаменаў, быў асаблівым. Нас, ужо атрымаўшых ва ўрачыстых абставінах студэнцкі білет і заліковую кніжку, універсітэт павінен быў выпрабаваць яшчэ і традыцыйнай работай на уборцы ураджаю. І мы разумелі, што гэта — таксама адзін з экзаменаў на званне студэнта. Працоўны экзамен.

Віцебшчына сустрэла прасторай бульбяных палёў і добразычлівасцю тых, хто іх даглядаў. Працавалі мы ў калгасе імя XXI з'езда КПСС. Убіралі лён, бульбу, сеялі азімыя. Ужо ў першыя дні на уборцы льну паказалі зайздросны спрыт Ала Ткачова, Люда Рабілка, Наташа Залыгіна, Ганна Мішута і іншыя. Нават калгасніцы, што працавалі побач, хвалілі нашых дзяўчат. Не адставала і мужчынская палавіна групы. Кіраўніцтва калгаса адзначыла работу Віктара Кураша, Валерыя Валяйцёнка, Васіля Кудраўцова, Валерыя Дзеркача і Валерыя Бялоўскага, якія ў вельмі сціслыя тэрміны засеялі азімы клін у адной з брыгад.

Ва ўмелай арганізацыі грамадскай работы і нашага вольнага часу — асноўная заслуга камсорга атрада В. Кудраўцова. Байцы нашага атрада дапамагалі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і сем'ям загінуўшых. Мясцовыя жыхары вельмі цёпла прымалі выступленні атраднай агітбрыгады. Цікава, што іменна гэтыя выступленні, сцэнкі з калгаснага жыцця нейк асабліва зблізілі нас з калгаснікамі. І вось гэта блізкасць з людзьмі, занятымі і захопленымі сваёй работай, атмасфера таварыскасці і ўзаемадапамогі ў атрадзе — усё станоўча ўплывала на фарміраванне нашага калектыву. Кожны з нас, ці то камуніст, ці то камсамолец, меў канкрэтнае даручэнне. І гэта таксама аб'ядноўвала нас. Дзелавыя размовы на сходах, штодзённыя палітінфармацыі, гарачыя спрэчкі на палітычныя і філасофскія тэмы — усё гэта ў значнай меры падрыхтавала рабят да будучага напружанага рытму заняткаў, да вучобы.

Першыя дні заняткаў былі для нас днямі другога пачатку. Мы знаёміліся з сябрамі з ГДР, Кубы і Польшчы, з якімі нам вучыцца і жыць адным калектывам. Сходы, новыя сустрэчы з выкладчыкамі, прадстаўнікамі брацкай Кубы, якія прыехалі пажадаць поспехаў сваім землякам, знаёмства з навуковай дзейнасцю факультэта, студэнцкімі традыцыямі — вось няпоўны пералік тых мерапрыемстваў, якія былі праведзены ў першыя вучэбныя тыдні.

Сёння жыццё на курсе ўвайшло ў рамкі, стала больш рэальным кола штодзённых праблем. На парадку дня — барацьба за паспяховую здачу зімовай сесіі.

**А. ЛОЙКА,**
**староста І курса аддзялення філасофіі.**

## У ПАЧАТКУ ШЛЯХУ

Лавінай абрушыліся разнастайныя лекцыі і практычныя. Адразу ж выявілася, што школу скончыў ужо даўно. Нялёгка. Але ж я —камсорг. Абавязаны паспяваць усюды.

У нас, на першым курсе юрыдычнага,—120 членаў ВЛКСМ. Выбрана камсамольскае бюро курса: 4 камуністы, 5 камсамольцаў. Большасць ужо працавалі ў камсамоле: адны — на заводзе, другія — у школе. Цяпер трэба настройвацца на работу ў студэнцкім асяроддзі, якое мы яшчэ не ведаем. Але жаданне працаваць ёсць у кожнага з нас. Вялікае жаданне.

120 камсамольцаў, а ў кожнага — свой характар. І кожны праяўляе яго па-рознаму.

На факультэце ішла падпіска. Давялося сутыкнуцца з такімі студэнтамі-мінчанамі, якія гаварылі, што ў іх, маўляў, ужо падпісаліся на газеты і часопісы дома, а самі яны ні на што не жадаюць падпісвацца. Вось і давялося камсоргам займацца індывідуальнай растлумачальнай работай. І яны справіліся.

Думаю, камсоргі нашых 6 груп — усе дастойныя людзі, якія будуць добра і цікава працаваць. Але дваіх, найбольш актыўных, хочацца вызначыць — гэта Галя Гаварушкіна, камсорг 4-й групы і камсамольскі важак 2-й групы Лена Калчанава.

Наша яшчэ маладая камсамольская арганізацыя крыху павольна, але затое ўпэўнена знаходзіць рытм сваёй работы. Чаму павольна? Будзем аб'ектыўнымі: па-першае, мы прыйшлі вучыцца. Як паказаў першы месяц — гэта не так проста. А камсамольскаму работніку добра вучыцца — абавязкова. Па-другое, мы павінны знайсці падыход да кожнага, а такі працэс няхуткі. І, па-трэцяе, у нас яшчэ не вельмі добра наладжаны кантакты з камсамольскім бюро факультэта. Разумеем: першакурснікі для яго—не адзіны клопат. Але нам іменна цяпер, у перыяд станаўлення, вельмі патрэбна яго дапамога.

Ну, а ў рабоце на курсе галоўная апора — гэта выпускнікі падрыхтоўчага аддзялення. Наша яшчэ не вельмі вопытнае камсамольскае бюро нярэдка звяртаецца за парадай і за дапамогай да Анатоля Войціка, Міхаіла Клопава, Аляксандра Аўсянікава. Яны прайшлі школу ПА. Ім лягчэй.

Думаю, што аснова будучага дружнага камсамольскага калектыву на першым курсе ўжо ёсць. І гэта дае надзею на поспех.

**В. ШЛАНДЫКОЎ,**
**камсорг І курса юрфака.**

## Цудоўна, калі многа сяброў!



Любая справа спорыцца, калі за яе ўзяцца дружна, калі побач з табою працуюць твае таварышы, калі адчуваеш побач пляцо сябра і ўпэўнен — ён не падвядзе. Гэта ў поўнай меры датычыцца і работы клуба інтэрнацыянальнай дружбы філфака.

На нашым факультэце 78 замежных студэнтаў. Як многа сяброў! Гэта цудоўна! Мы разам праводзім тыдні дружбы, вечары музыкі, літаратуры, адпачынку, сустрэчы з выкладчыкамі, ветэранамі вайны і працы, арганізоўваем паездкі, паходы... А колькі адбываецца гутарак, дыспутаў! Святы сяброў сталі нашымі, таму што мы даўно ўжо ўсё дзелім папалам. У нашым КІДзе многа замежных студэнтаў. Прыемна бачыць, з якім запалам бяруцца за работу польскія студэнты Беата Казлоўска і Ханка Вадас. І няма таго, што было б немагчымым для гэтых мілых дзяўчат. Цудоўна працуе аспірант з Ірака Галеб аль Тамімі.

На нашых пасяджэннях мы многа спрачаемся. Шмат цудоўных ідэй нарадзілася ў такіх спрэчках. А колькі іх яшчэ наперадзе!

Надоўга запомніўся нам інтэрнацыянальны вечар у педвучылішчы. Гэта быў своеасаблівы дэбют клуба. Нашы рабяты разам з камітэтам камсамола вучылішча прадумалі і абмеркавалі сцэнарый. І вось усё гатова — мы на сцэне. Замежныя студэнты шмат расказалі новым сябрам аб сваіх краінах, іх славутасцях і традыцыях, аб моладзі, культуры і мастацтве. Сыпаліся пытанні, і рабяты атрымлівалі поўныя і цікавыя адказы. Затым быў канцэрт. На якіх толькі мовах не гучалі песні: рускай, нямецкай, польскай, іспанскай. Усе пелі, «таму што свет без песень цесны». І традыцыйная «Кацюша», мілая і дарагая кожнаму як сімвал дружбы, была выканана на развітанне.

Нас запрашалі зноў і вельмі чакалі. Так завязалася цесная дружба, і цяпер нашы малодшыя сябры — частыя госці факультэцкіх інтэрнацыянальных вечароў.

Нязменны спадарожнік кожнага з іх — выстаўкі, газеты, фотастэнды. Студэнты павінны быць пастаянна ў курсе міжнародных падзей — мы стараліся не забываць гэтага, арганізоўваючы вечары. І абавязкова— дыскатэкі, бо музыку любяць усе.

Вельмі цікавай была сустрэча савецкіх, польскіх і нямецкіх студэнтаў, якая праходзіла пад назвай «Маладзёжныя арганізацыі і іх роля ў выхаванні маладога пакалення». Было многа спрэчак, выказваліся розныя думкі і заўвагі. Але усе сышліся ў адным: маладзёжныя арганізацыі неабходны, яны прыцягваюць і вядуць за сабой моладзь, яны клічуць наперад, да новых цікавых спраў.

Не ўсё ў рабоце клуба лёгка і проста. Пачынаць заўсёды цяжка, а наш КІД—адзін з першых ва універсітэце. Не заўсёды члены сектара інтэрработы камітэта камсамола універсітэта дапамагаюць нам.

Нашы дзяўчаты Ларыса Петрыкевіч і Люда Станкевіч з вялікай цікавасцю пісалі пісьмы ў КІДы розных ВНУ Масквы, Ленінграда, Кішынёва, Адэсы, перапісваліся са студэнтамі Люблянскага, Варшаўскага, Йенскага універсітэтаў, цікавіліся, як пастаўлена інтэрработа, расказвалі аб сваёй. Нам вельмі дапамог іх вопыт.

Прыйшоў новы навучальны год. Наша дружная інтэрнацыянальная сям'я папоўнілася новымі членамі. Рытм жыцця ўсё нарастае. І мы вельмі гэтаму рады. Мы спадзяемся, што і гэты год прынясе клубу шмат поспехаў, новыя сустрэчы і знаёмствы. Кідаўцы папранейшаму вясёлыя і актыўныя, значыць, справа будзе спорыцца.

**Н. МАСТЫКАВА,**
**адказная за інтэрнацыянальнае выхаванне камітэта камсамола філфака.**

# Палажэнне

**аб правядзенні агляду-конкурсу палітычнай песні, прысвечанага 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі.**

Рэктарат, партком, прафком, камітэт камсамола і праўленне клуба Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна запрашаюць калектывы і асобных выканаўцаў прыняць удзел у другім аглядзе-конкурсе палітычнай песні.

Мэта агляду — далейшае развіццё самадзейнай мастацкай творчасці на факультэтах, прапаганда сродкамі мастацтва сусветна-гістарычнага значэння Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, гераічнай гісторыі Камуністычнай партыі Савецкай краіны, рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцый народа — будаўніка камуністычнага грамадства; павышэнне ідэйна-мастацкага ўзроўню самадзейнасці.

Журы агляду вызначае тры першыя месцы сярод выканаўцаў. Нумары мастацкай самадзейнасці ацэньваюцца па дзесяцібальнай сістэме. Пры падвядзенні вынікаў выступленняў журы будзе ўлічваць тэматыку ўключаных у рэпертуар песень, іх палітычную злабадзённасць, грамадзянскасць, выканаўчае майстэрства, сцэнічную культуру ўдзельнікаў агляду. Журы агляду і прафком устанаўліваюць узнагароды за тры першыя месцы сольных выступленняў, за тры першыя месцы сярод вакальных ансамбляў (дуэты, трыо, квартэты і г. д.), за тры першыя месцы выступленняў вакальна-інструментальных ансамбляў. Будзе ўстаноўлены спецыяльны прыз камітэта камсамола за аўтарства.

Агляд-конкурс палітычнай песні будзе праводзіцца ў актавай зале універсітэта 8—9 снежня 1978 года.

У аглядзе могуць удзельнічаць супрацоўнікі і студэнты дзённага і вячэрняга навучання.

У час агляду факультэты павінны прадставіць розныя формы выканання палітычнай песні: сольныя выступленні, дуэты, трыо. Кожны калектыў або асобны выступаючы мае права выканаць дзве песні прафесіянальных або самадзейных аўтараў і кампазітараў.

Праграму выступлення факультэты павінны прадставіць у праўленне клуба не пазней 1 снежня ў дзесяці экземплярах з указаннем прозвішча і імя аўтараў і выканаўцаў песні. Для песень, выконваемых на замежнай мове, прадставіць парадковы пераклад.

# Старт навуковай алімпіяды

У гэтым навучальным годзе алімпіяда «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс», прысвечаная XI Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў у Гаване, праводзіцца ва універсітэце з 1 кастрычніка 1978 года па 1 красавіка 1979 года па наступных напрамках:

— прадметныя алімпіяды;

— конкурсы па спецыяльнасці;

— агляд курсавых і дыпломных работ;

— агляд-конкурс вынікаў вытворчай практыкі.

Як і ў мінулым годзе, першы этап праводзіцца з 1 кастрычніка 1978 года па 15 сакавіка 1979 года на факультэтах; другі (для выяўлення пераможцаў 1 тура алімпіяды)—з 15 сакавіка па 1 красавіка 1979 года — агульнауніверсітэцкі.

Для правядзення першага этапа алімпіяды на кожным факультэце створаны арганізацыйныя камітэты з прадстаўнікоў партыйных і грамадскіх арганізацый, загадчыкаў кафедр і вядучых вучоных, на чале з дэканамі факультэтаў ці іх намеснікамі.

На кожным факультэце распрацоўваюцца тэматыка і заданні для прадметных алімпіяд па агульнанавуковых дысцыплінах. Адпаведнымі кафедрамі распрацаваны канкрэтныя заданні і тэматыка прадметных алімпіяд, якія прадугледжваюць праверку ведаў студэнтаў па тэарэтычных пытаннях, рашэнні задач, правядзенне эксперыментаў, напісанне рэфератаў і паведамленняў.

Тэматыка і заданні для правядзення конкурсу па спецыяльнасці таксама распрацоўваюцца кафедрамі.

Пры падвядзенні вынікаў конкурсу ўлічваецца падрыхтоўка студэнтаў па агульнанавуковых галінах, эканоміцы, навуковай арганізацыі працы, а таксама ўменне прымяняць атрыманыя веды на практыцы.

Агляд курсавых і дыпломных работ праводзіцца кафедрамі, якія здзяйсняюць кіраўніцтва гэтым відам вучэбнай работы.

Пераможцамі конкурсу лічацца студэнты, навуковыя работы якіх выкананы па актуальнай тэматыцы, маюць арыгінальныя навуковыя, канструктарскія ці тэхналагічныя рашэнні, могуць быць выкарыстаны ў вытворчасці, атрымалі аўтарскія пасведчанні або надрукаваны.

Агляд-конкурс вынікаў вытворчай практыкі праводзіцца кафедрамі, якія кіруюць практыкай студэнтаў. Пры арганізацыі і правядзенні агляду-конкурсу прадугледжваюцца мерапрыемствы па прыцягненню студэнтаў да актыўнага ўдзелу ў вытворчай, навукова-даследчай і грамадскай дзейнасці калектываў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый.

Пераможцы прадметных алімпіяд рашэннем аргкамітэта універсітэта будуць рэкамендаваны для ўдзелу ў другім туры алімпіяды, які будзе праведзен у г. Мінску ў красавіку—маі 1979 года. Другі тур у рамках рэспубліканскага конкурсу пераможцаў першага тура прадугледжвае алімпіяды па грамадскіх дысцыплінах і конкурсы па спецыяльнасці (матэматыцы, фізіцы, хіміі, біялогіі, рускай мове і літаратуры, замежных мовах).

Цяпер ва універсітэце заканчваецца агляд-конкурс курсавых і дыпломных работ.

**Г. СТУКАНАВА,**
**метадыст вучэбна-метадычнага кабінета.**

# «Інтэрнацыянал» на розных мовах



...Песня клікала на барацьбу. І хаця студэнты, якія сабраліся на ўрачыстасць, не разумелі грэчаскай мовы, але манера выканання і мелодыя гаварылі самі за сябе.

Вечар, прысвечаны 60-годдзю Камуністычнай партыі Грэцыі, пачаўся.

— Мы вельмі рады, што дзеці славутай Элады, якая ўнесла ў скарбніцу сусветнай культуры высокія ўзоры мастацтва і літаратуры, прыехалі вучыцца на факультэт журналістыкі нашага універсітэта, — гэтымі словамі прывітала студэнтаў з Грэцыі сакратар партарганізацыі дэканата па рабоце з замежнымі студэнтамі Нэлі Піманаўна Густоўская. Яна павіншавала Катэрыну Дуру, Варвару Калюсі, Дзімітрыса Фатыноса, Яніса Сарадыса, Нікаса Падаржыса, Ірыну Карнаву і Афрадыту Панаёту з іх святам. Аб Камуністычнай партыі Грэцыі расказаў Яніс Сарадыс:

— Наша партыя, нягледзячы на ганенні, якім яна падвяргалася, вытрымала выпрабаванне часам. Сёння яна з'яўляецца адзінай палітычнай партыяй у Грэцыі з 60-гадовым стажам.




З першага дня ўтварэння яе члены разгарнулі шырокую работу, сталі той сілай, якая ўзняла палітычную свядомасць рабочага класа да разумення сваёй гістарычнай місіі — змагацца за вызваленне ўсіх эксплуатуемых і прыгнечаных. Дабіўшыся легалізацыі пасля звяржэння фашысцкай дыктатуры ў 1974 годзе, КП Грэцыі выступае за згуртаванне грэчаскага народа і вызваленне ад амерыканскай і натаўскай апекі, за нацыянальную незалежнасць, мір, дэмакратыю, сацыялізм. Камуністы ўзначалілі масавую барацьбу за ліквідацыю замежных баз і вызваленне краіны ад імперыялістычнага і манапалістычнага панавання, за канчатковую ліквідацыю перажыткаў фашызму. Наша Камуністычная партыя дае мужны адпор раскольніцкай і рэвізіяніцкай групоўцы — так званай «унутранай» камуністычнай партыі, само існаванне якой кіруючыя колы выкарыстоўваюць для таго, каб нанесці ўдар па КПГ.

Ад імя камітэта камсамола універсітэта грэчаскім студэнтам былі ўручаны сувеніры.

«Сапраўдныя героі, магутныя, як горы», — так грэчаскі народ гаворыць аб партызанах. «Непераможныя горы»—песня, якая прагучала на вечары пад акампанемент народнага інструменту бузукі ў выкананні грэкаў. Прысутныя ўбачылі некалькі грэчаскіх танцаў — «Сіртос», «Зейнбекіна», «Сіртакі».

Удзел ва ўрачыстасці таксама прынялі студэнты з Чэхаславакіі і ГДР, якія вучацца на філалагічным і фізічным факультэтах БДУ.

Вечар, прысвечаны 60-годдзю Камуністычнай партыі Грэцыі, ператварыўся ў мітынг салідарнасці беларускіх і замежных студэнтаў у барацьбе за мір, дэмакратыю, камунізм. І хаця «Інтэрнацыянал» прысутныя ў зале пелі на розных мовах свету, але мэты і імкненні ў нас адзіныя.

**А. ЯКУБОЎСКАЯ,**
**студэнтка II курса факультэта журналістыкі.**

**На здымках: з цікавай канцэртнай праграмай выступілі на вечары грэчаскія студэнты.**

**Фота А. Стадуба.**

Лісток ДАІ

# АСЦЯРОЖНА: слізкая дарога!

Гэтая восень не асабліва абдорвае добрым надвор'ем. Частыя дажджы і слізкая праезджая частка аказалі прыкметны ўплыў на стан аварыйнасці ў нашым горадзе. У верасні ў Мінску адбылося 68 дарожна-транспартных здарэнняў, у выніку якіх 69 чалавек паранена і 6 загінула. Слізкая дарога.. Гэтыя абставіны суправаджалі амаль кожнае з няшчасцяў.

Вядома, што на мокрай дарозе счапленне шын з асфальтам слабее прыкладна ўдвая. Гэта значыць, што калі на шляху руху машыны раптоўна ўзнікае нейкая перашкода, пазбегнуць сутыкнення або наезду практычна немагчыма.

Правілы дарожнага руху прадпісваюць вадзіцелю пры выбары хуткасці ў абавязковым парадку ўлічваць дарожныя і атмасферныя ўмовы, а таксама стан праезджай часткі. Такім чынам, калі дарога мокрая, хуткасць руху павінна быць ніжэй, чым у звычайных умовах, а адлегласць паміж транспартнымі сродкамі, якія рухаюцца, павінна быць павялічана. На практыцы гэтыя патрабаванні далёка не заўсёды выконваюцца, што, як правіла, прыводзіць да дарожна-транспартных здарэнняў.

Неспрыяльнае надвор'е павінен заўсёды ўлічваць і пешаход. Памятайце, што на мокрай дарозе кіраванне машынай значна ўскладняецца, тармазны шлях узрастае ў многа разоў, і раптоўнае паяўленне перад машынай, якая рухаецца, у такіх выпадках найбольш небяспечна.

Слізкая дарога... Колькі разоў гэтыя абставіны, памножаныя на бестурботнасць і недысцыплінаванасць асобных удзельнікаў руху, станавіліся прычынай вялікіх пакут. І не ўлічваць гэтага нельга.

**Р. АЎРАМЕНКА,**
**старшы інспектар ДАІ г. Мінска.**

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Заказ № 1711. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. АТ 03651